Аксана Пунінская:

# “Наш гістарычны скарб і скарбніца нашай гісторыі”

**Такое свята адзначаецца параўнальна нядаўна. Разам з тым для Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэкі яно асабліваe: сёлета Мінская РЦБ адзначае сваё 90-годдзе. Гэта значная дата для калектыва раённай бібліятэкі, са сваёй багатай гісторыяй, знакамітымі людзьмі, цікавымі падзеямі. Бібліятэка пераязджала з аднаго будынка ў другі, ладкавалася на новым месцы, змяняліся людзі, якія ўносілі свой непаўторны запамінальны ўклад у развіццё бібліятэчнай сістэмы. Ужо больш за 20 гадоў раённая бібліятэка знаходзіцца ў аграгарадку Міханавічы.**

Гэта прыстасаваны аднапавярховы будынак, які знаходзіцца побач з чыгункай Мінск—Асіповічы. Але калектыў вельмі ганарыцца тым, што чытачоў прыцягвае ўтульнасць і самабытнасць, цеплыня і любоў, якія дарue калектыў раённай бібліятэкі.



## Гартаючы старонкі гісторыі

Вядома, ад тых далёкіх часоў засталіся толькі ўспаміны, ды і тыя абрыўкамі. Так, гісторыяй зафіксавана, што ў 1910 годзе на Міншчыне, якая з'яўлялася ўскраінай царскай Расіі, было ўсяго 7 бібліятэк і 5 чытальняў. 1918 год. Барацьбу з непісьменнасцю актыўна вялі хаты-чытальні з бібліятэчкай па 50—60 кніг і газетамі таго часу "Беднята", "Новая вёска" і інш. У Мінскім павеце да канца верасня 1920г. адкрылася 14 народных дамоў, 6 бібліятэк і 80 хат-чытальняў.

...ралізаваная бібліятэчная сістэма. У 1991 годзе Мінская раённая цэнтральная бібліятэка з Заслаўя пераведзена ў пасёлак Міханавічы ў прыстасаванае памяшканне былой сярэдняй школы. Вялікі ўклад у развіццё бібліятэчнай справы раёна зрабіла былы дырэктар раённай бібліятэкі В.Я.Жыдовіч (зараз на заслужаным адпачынку).

Кіруюць гэтым творчым калектывам дырэктар Аксана Ільінічна Пунінская і яе намеснік Наталля Валер'еўна Няхай.

— Мне, як дырэктару раённай цэнтральнай бібліятэкі, — гаворыць Аксана Ільінічна, — вельмі прыемна адзначыць, што інтарэс да чытання не змяншаецца, што электронныя гаджэты, якія імкліва ўрываюцца ў



...якая знойдзе свайго чытача, задаволіць яго запатрабаванні, дапаможа навучальнаму працэсу, будзе карыснай у правядзенні вольнага часу. Загадчык аддзела Таццяна Валянцінаўна Багатыр, якая больш за 30 год таму прыйшла маладым спецыялістам у бібліятэчную сістэму раёна і засталася тут назаўсёды. Асоба, глыбока адданая сваёй рабоце, ініцыятыўная, граматная, улюбёная ў бібліятэчную справу. Працавітыя, незвычайныя і супрацоўнікі: галоўны бібліятэкар аддзела Аксана Канстанцінаўна Раманюк, бібліятэкары Наталля Мікалаеўна Носава, Інна Адамаўна Копцік, Людміла Васільеўна Леўдаровіч. У час інфармацыйных тэхналогій, разнастайнасці паслуг і прадукцыі, трэба шмат намаганняў прыкласці, каб вывесці сваю ўстанову на належны ўзровень, каб дастукацца да свайго карыстальніка. З гэтай задачай вельмі паспяхова спраўляецца аддзел бібліятэчнага маркетынгу, які арганізоўвае рэкламу дзейнасці бібліятэк у сродках масавай інфармацыі, займаецца падтрымкай іміджу бібліятэк і фарміраваннем грамадскай думкі, ладзіць сувязі с грамадкасцю. Загадчык аддзела Наталля Аляксандраўна Кечык адпрацаваўшая ў раённай бібліятэцы больш за дзесяць гадоў. Разам з ёй шмат гадоў працуе апантаваная, улюбёная ў сваю работу, неардынарная асоба Сезень Таццяна Анатольеўна, галоўны бібліятэкар аддзела. Трэба быць тонкім псіхолагам, высокакваліфіцыраваным спецыялістам, выдумшчыкам, добрым арганізатарам і проста вельмі адукаваным чалавекам, каб працаваць у